# ФАКТЫ З ЖЫЦЦЯ АЛАІЗЫ ПАШКЕВІЧ

# ЗМАЛКУ НЕ ХАЦЕЛА БЫЦЬ ХАТНЯЙ ГАСПАДЫНЯЙ

Паводле старэйшага брата Войцеха: «Бабка /вучыла/ унучку ручным работам, але яна імі неахвотна займаецца, не мае да іх «ніякае здольнасці». Адзінае што любіла гатаваць – гэта дранікі».

# ЛЮБІЛА РАСКАЗВАЦЬ КАЗКІ ЖАХАЎ І ВЫДУМЛЯЦЬ МІСТЫЧНЫЯ ГУЛЬНІ

Любімы занятак у дзяцінстве – гуляць «...у цыганоў, ксяндза-казнадзея ды розных варажбітоў», а таксама палохаць малодшых сясцёр гісторыямі жахаў: «...бывала, як навыдумляе розных страхаў, у якія і сама верыла, – дык дзеці ажно да бабкі ўцякалі на ратунак!»

# БЫЛА ВЕЛЬМІ ГАНАРЛІВАЯ І НЕ ПРЫМАЛА ЧУЖОЙ ДАПАМОГІ

*Калі ў 7-м класе абамлела ад голаду, то яе аднакласніца Юліяна Мэнке пайшла на хітрыкі: «Мне рабіла асаблівую прыемнасць... класці няўзнак булкі ў пюпітр Алёйзы Пашкевічанкі. Яна спачатку пыталася ў класе, хто гэта..., аднак вінаватая не аказвалася, а класная дама супакойвала яе, што гэта, мусіць, падарунак. Гэтак мы рабілі да сканчэння гімназіі».*

# БУДУЧЫ КАТАЛІЧКАЙ, ПЕРАВАГУ АДДАВАЛА ЎНІЯЦТВУ

«Унія для беларусаў была б крэпкай падпорай, бо лацінскае духавенства ў нас на нішто». Ёсць звесткі, што Цётка пераклала на беларускую мову ўкраінскі уніяцкі малітоўнік, але тэкст пакуль не знойдзены.

# БЫЛА ПРАФЕСІЙНАЙ МАСАЖЫСТКАЙ

Масажам зарабляла на ўрокі акторскага майстэрства, якія брала ў легендарнай польскай акторкі Ірэны Сольскай.

# ГРАЛА Ў П'ЕСАХ АНТОНА ЧЭХАВА

Выступала як акторка ў трупе Ігната Буйніцкага, дзе сярод шматлікіх сцэнічных вобразаў: «...рыхтуе ролю Наталкі ў спектаклі „Сватанне“ па Чэхаву...»

# НЕ ТРЫВАЛА АЛЬКАГОЛЬНЫЯ ЗАСТОЛЛІ

Адзін раз у жыцці дазволіла, каб пры ёй пілі, калі адзначалі выхад першага нумару «Нашай долі». Паводле ўспамінаў Францішка Умястоўскага: «...Не ведаю, скуль узялася гарэлка і закуска, наліўшы чаркі, нягледзячы на косыя погляды Цёткі, якая не цярпела п'ючай кампаніі, мы духам асушылі іх за Будучыню Бацькаўшчыны...»

# ЛЮБІМЫ АДПАЧЫНАК – МАРЫЦЬ І ЧАСТАВАЦЦА КАЎБАСОЙ ПАД СПЕВЫ САЛАЎЁЎ

*Па ўспамінах Івана Свяніціцкага: «Цётка прыходзіць да мяне ў музей, ужо надвечар: „Дзядзька, пойдзем слухаць салаўёў, у мяне ёсць беларуская кілбаса“. Пайшлі ў... парк, знайшлі месца каля гайка, людзі снуюць парамі і гуртамі, салавейкі тут і там цёхкаюць і залівающца. Цётка глядзіць у зорнае неба, жуе кілбасу і марыць».*

# ЗАХАПЛЯЛАСЯ ТВОРЧАСЦЮ МІКЕЛАНДЖЭЛА

Паводле ўспамінаў жонкі паэта Ёнаса Білюнаса: «Вельмі вялікае ўражанне на нас з Лізаю зрабілі «Піета» Мікеланджэла, якую мы бачылі ў саборы святога Пятра, фрэскі плафона Сыкстынскай капэлы ў Ватыкане. Асабліва запомніліся „Страшны суд", „Сатварэнне Адама", „Сатварэнне жанчыны". ... Моцна запала ў памяць і скульптура прарока Майсея ў царкве Сан Петра ў Рыме».

# МЕЛА КЕПСКІЯ ЗДОЛЬНАСЦІ ДА МОВАЎ, ШТО ВЫКЛІКАЛА КАМІЧНЫЯ НЕПАРАЗУМЕННІ

У Рыме, на канцэрце Каруза: «...усе елі апельсіны, цукеркі, кідалі паперу і шалупінне на падлогу, хрумсталі, перашкаджалі слухаць. Ліза не вытрымала, пачала абурацца, сарамаціць іх, але мовы не ведала і рабіла гэта мімікаю і жэстамі. Жэсты былі эмацыйныя, выразныя, і гэта развесяліла публіку яшчэ больш. Хлопцы пачалі частаваць Лізу апельсінамі, каб яна не пакрыўдзілася... Ліза злавалася, гразіла ім кулаком, але нічога не памагала...»

# ПАЧУЎШЫ ПЕСНЮ ПРА КАХАННЕ, ГАТОВАЯ БЫЛА СТАЦЬ НА КАЛЕНІ ПЕРАД ТЫМ СПЕВАКОМ

*«Мы... селі ў трамвай. Насупраць нас... аказаўся малады прыгожы італьянец. Убачыўшы нас, ён пачаў спяваць песні аб каханні. Спявае і ўсё глядзіць – як мы рэагуем. Спяваў ён вельмі добра, і скора Ліза прыйшла ў такое захапленне, што пачала шаптаць мне: „Зараз стану перад ім на калені, перад яго талентам...“ ... Тут хутка трамвай спыніўся, і італьянец, паслаўшы нам развітальны позірк, выйшаў...»*

# З УСІМІ БЫЛА НА «ТЫ»

«...Сваёй манерай паводзін яна не ўжывалася ні ў якім таварыстве, звяртаючыся да мужчын „ты, дзядзенька“. Часамі яе праставатасць здавалася напускною, бо ад прыроды ў яе была тонкасць паводзін».

# ТАНЦАВАЛА ТОЛЬКІ З ЯНКАМ КУПАЛАМ

«Яна… асабліва любіла свайго „Купалку“, як ласкава называла Янку. На вечарах у „Беларускай хатцы“ Цётка… танцавала… толькі з Купалам і толькі польку, бо іншых танцаў Янка не ўмеў танцаваць і вучыцца не хацеў».

**ПАЧЫНАЛЬНІЦА Ў БЕЛАРУСІ АСАЦЫЯТЫЎНА-МАДЭРНОВАЙ ПРОЗЫ, ДЗЕ ГАЛОЎНАЕ – НЕ СЮЖЭТ, А ПАГЛЫБЛЕННЕ ВА ЎНУТРАНЫ, НЕ ДА КАНЦА АСЭНСАВАНЫ, ТАЕМНЫ, ЯК СОН – СВЕТ ПАЧУЦЦЯЎ І ДУМАК ЧАЛАВЕКА**

*Пазней гэтую эстэтыку паглыбіў і распрацаваў Кузьма Чорны.*

# МАРЫЛА АЖАНІЦЬ ІВАНА ЛУЦКЕВІЧА

Нявестай яму бачыла Юліяну Мэнке: «...маё сардэчнае пажаданне, каб вы злучыліся на ўсё жыццё, бо лепшай пары я для яго не ведаю. Ён для цябе мае запраўды шмат сэрца і інтарэсу... Я спадзяюся, што яшчэ пагуляю на вашым вяселлі!»

# ЛІЧЫЛА, ШТО ГАЛОЎНАЕ Ў ЖЫЦЦІ – ГЭТА КАХАННЕ

*«...запраўднае каханне – змест і асалода жыцця!».*

# АД ЦАРСКАГА ПЕРАСЛЕДУ ХАВАЛА РЭВАЛЮЦЫЯНЕРАЎ У ВАР'ЯТНІ

Працавала медсястрой ў Нова-Вілейскім шпіталі для вар'ятаў, у палатах якога хавала паплечнікаў па барацьбе. А ў падземным тунэлі трымала шапірограф, на якім друкавала пракламацыі.

# ЗАХАПЛЯЛАСЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ ПАПА ГАПОНА

*Натхнялася яго адозвамі, калі пісала верш «Хрэст на свабоду». Для параўнання, у Гапона: "Бомбы и динамит, террор единичный и массовый над твоим отродьем и грабителями бесправного люда, народное вооруженное восстание, – все это должно быть... непременно. У яе: «Тагды Гапон у грамаду бяжыць, крычыць: «Трэба ладу, трэба шроту, бомбаў, стрэльбаў, трэба біць нам гэтых шэльмаў..!»*